Весці БДПУ. Серыя 2. 2022. № 2. С. 45–49

*УДК 94:331.105 (476)*

# КАЛЕКТЫЎНА-ДАГАВОРНАЕ РЭГУЛЯВАННЕ ПРАЦОЎНЫХ АДНОСІН У БЕЛАРУСІ Ў 70–80-я гг. XX ст.

**А. А. Дубовік,**
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры сацыяльнага кіравання БНТУ*

*UDC 94:331.105 (476)*

# TEAM-CONTRACT REGULATION OF LABOR RELATIONS IN BELARUS IN 70–80s OF THE 20th CENTURY

**A. Dubovik,**
*PhD in History, Associate Professor, Associate Professor of the Department of Social Management, BNTU*

Паступіў у рэдакцыю 25.03.22.

Received on 25.03.22

У 1970–1980-я гг. было пашырана кола прадпрыемстваў і арганізацый, на якіх павінен быў заключацца калектыўны дагавор. Закон СССР «Аб працоўных калектывах і павышэнні іх ролі ў кіраванні прадпрыемствамі, установамі і арганізацыямі» (17 чэрвеня 1983 г.) павялічыў паўнамоцтвы працоўных калектываў у сферы калектыўна-дагаворнага рэгулявання. У сувязі з прыняццем Закона роля і значэнне калектыўных дагавораў узраслі. Калектыўны дагавор стаў важным дакументам, які рэгламентаваў унутранае жыццё працоўнага калектыву. Узрасла сацыяльная накіраванасць калектыўных дагавораў. Развіццё ў 1970–1980-х гг. калектыўна-дагаворнай работы ў БССР мела важнае значэнне для павышэння актыўнасці працоўных мас і ролі прафсаюзаў у вырашэнні сацыяльных пытанняў.
Аднак у калектыўна-дагаворнай рабоце было шмат фармалізму. Разам з тым, пэўны вопыт калектыўна-дагаворнога рэгулявання працоўных адносін, назапашаны ў даследуемы перыяд, знайшоў прымяненне пры фарміраванні сістэмы сацыяльнага партнёрства ў Рэспубліцы Беларусь у 1990-я гг.

*Ключавыя словы:* працоўныя адносіны, калектыўны дагавор, калектыўна-дагаворнае рэгуляванне працоўных адносін, прафсаюзы, працоўныя калектывы, сацыяльнае партнёрства.

In 1970-1980s there existed a number of enterprises and organizations which required conclusion of team contract. The USSR Law “On labor teams and increase of their role in management of enterprises, establishments and organizations” (June 17, 1983) increased the authorities of labor teams in the sphere of team-contract regulation. Due to accepting the Law the role and significance of team contracts grew. Team contract became an important document that regulated the inner life of a labor team. The social direction of team contracts grew. Development of team-contract work in BSSR in 1970-1980s had an important meaning for increasing the activity of labor masses and the role of trade unions in solving social matters. However, there was a lot of formalism in team-contract work. Besides, certain experience of team-contract regulation of labor relations accumulated in the period under study found its application in forming the system of social partnership in the Republic of Belarus in 1990s.

*Keywords:* labor relations, team contract, team-contract regulation of labor relations, labor teams, social partnership.

*Уводзіны.* Важнай формай удзелу працоўных у кіраванні прадпрыемствамі, эфектыўным інструментам абароны правоў і законных інтарэсаў працуючых з’яўляецца калектыўны дагавор. Вывучэнне гісторыі развіцця калектыўна-дагаворнага рэгулявання працоўных адносін мае вялікае навукова-практычнае значэнне, таму што яно стала передумовай для станаўлення сістэмы сацыяльнага партнёрства ў Рэспубліцы Беларусь. Мэта артыкула – раскрыць працэс развіцця калектыўна-дагаворнай работы ў БССР у 1970–1980-я гг., паказаць удзел у гэтай справе прафесійных саюзаў. Папярэднія этапы гісторыі калектыўна-дагаворнай работы ў Беларусі (у перыяд НЭПа і ў пасляваенны час) знайшлі адлюстраванне ў іншых публікацыях аўтара [1, 2]. Калектыўна-дагаворнае рэгуляванне працоўных адносін у БССР у 1970–1980-я гг. атрымала пэўнае асвятленне ў навуковых працах па гісторыі рабочага класа і прафсаюзаў Беларусі [3, 4], але не з’яўлялася прадметам спецыяльнага даследавання.

*Асноўная частка.* Асновы заканадаўства Саюза ССР і саюзных рэспублік аб працы 1970 г., Кодэкс законаў аб працы БССР 1972 г. асаблівых змен ва ўяўленні аб сутнасці калектыўнага дагавора не ўнеслі, канцэпцыя засталася ранейшай. У пачатку 1970-х гг. была адменена абавязковая рэгістрацыя калектыўных дагавораў вышэйстаячымі прафсаюзнымі і гаспадарчымі органамі. Гэта павінна было павысіць адказнасць адміністрацыі і прафкамаў прадпрыемстваў за забеспячэнне законнасці лакальных нарматыўных актаў. Кантроль за легітымнасцю ўмоў калдагавора ўскладаўся на гаспадарчыя і прафсаюзныя ор-

ганы, аднак прававыя формы кантролю прадугледжаны не былі. Разам з тым, актывізуецца практыка праверкі ходу і падвядзення вынікаў выканання калектыўных дагавораў. Напрыклад, у 1974 г. ход іх выканання ў Беларусі быў абмеркаваны больш чым на 27 тыс. рабочых сходах і канферэнцыях, у якіх прымалі ўдзел 92–97 % рабочых і служачых [5, с. 53].

У 1976 г. права заключэння калектыўных дагавораў было дадаткова распаўсюджана на навукова-даследчыя ўстановы, канструктарскія, праектна-канструктарскія і тэхналагічныя арганізацыі, на прадпрыемствы жылкамунгаса, нарыхтовак, на арганізацыі матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння. Таму калі ў 1960-х гг. на прадпрыемствах і ўстановах рэспублікі заключалася каля 5 тыс., то ў канцы 1970-х гг. – звыш 6 тыс. калектыўных дагавораў [3, с. 230–231].

У 1978 г. работнікі прадпрыемстваў і ўстаноў БССР пры абмеркаванні на сходах і канферэнцыях праектаў калдагавораў унеслі 57 тыс. прапаноў, накіраваных на павышэнне эфектыўнасці вытворчасці, паляпшэнне ўмоў працы, быту, культурнага абслугоўвання, з іх 42 тыс. (73,7 %) былі ўключаны ў дагаворы, а астатнія прыняты адміністрацыяй для вырашэння ў аператыўным парадку [3, с. 231].

Аднак, як паказала даследаванне, больш паловы пунктаў калектыўных дагавораў складалі правілы, устаноўленыя ў цэнтралізаваным парадку. Такі падыход да зместу дагавора быў у пэўнай ступені апраўданы тым, што прадпрыемствы знаходзіліся выключна ў дзяржаўнай уласнасці. Негатыўным фактарам з'яўлялася іх недастатковая гаспадарчая самастойнасць. Прадпрыемствы не валодалі ўласнымі сродкамі, у сувязі з чым у дагаворах не знаходзілі адлюстравання мерапрыемствы, якія патрабавалі матэрыяльных затрат, за выключэннем выпадкаў, калі сродкі выдзяляліся вышэйстаячымі органамі. У выніку калектыўны дагавор з'яўляўся фармальным дакументам, дагаворная сутнасць і рэгулятыўнае значэнне якога былі зведзены да мінімуму.

Разам з тым, у 1980-я гг. адбывалася ўдасканальванне калектыўна-дагаворнага рэгулявання працоўных адносін. Адным з кірункаў палітыкі дзяржавы становіцца прадастаўленне большай гаспадарчай самастойнасці прадпрыемствам на аснове гаспадарчага разліку і самакіравання. Пачатак новаму этапу ў рэгуляванні працоўных адносін быў пакладзены Законам СССР «Аб працоўных калектывах і павышэнні іх ролі ў кіраванні прадпрыемствамі, установамі і арганізацыямі» (17 чэрвеня 1983 г.), які пашырыў правы прадпрыемстваў. Павялічыліся паўнамоцтвы працоўных калектываў у сферы калектыўна-дагаворнага рэгулявання: ім прадастаўлялася права не толькі ўдзельнічаць у распрацоўцы і абмеркаванні калектыўных дагавораў, але і прымаць рашэнні аб іх заключэнні. У сувязі з прыняццем Закона роля і значэнне калектыўных дагавораў узраслі. Калектыўны дагавор стаў важнейшым дакументам, які рэгламентаваў унутранае жыццё працоўнага калектыву. Для кантролю за законнасцю ўмоў калектыўных дагавораў аднавілася практыка іх рэгістрацыі ў вышэйстаячых прафсаюзных і гаспадарчых органах [6].

У 1984 г. адбыліся змены ў парадку заключэння калектыўных дагавораў: пашырана кола прадпрыемстваў, на якіх павінен быў заключацца дагавор, больш падрабязна вызначаны змест яго абавязацельнай часткі. Палажэннем аб парадку заключэння калектыўных дагавораў, зацверджаным пастановай Прэзідыума УсеЦСПС і Дзяржаўнага камітэта СССР па працы і сацыяльных пытаннях ад 28 верасня 1984 г., было ўстаноўлена абавязковае штогадовае заключэнне калектыўных дагавораў на прадпрыемствах, вытворчых і навукова-вытворчых аб'яднаннях (ВА і НВА) усіх галін, а таксама ў навукова-даследчых інстытутах (НДІ), арганізацыях культуры, мастацтва і інш. [7]. Павысілася адказнасць адміністрацыйна-кіраўніцкага персаналу за выкананне дагавораў. Палажэнне, прыведзенае ў адпаведнасць з Законам СССР аб працоўных калектывах, пачало паўней адлюстроўваць іх правы і паўнамоцтвы. Працоўны калектыў меў права ацэньваць работу адміністрацыі і прафсаюзнага камітэта па рэалізацыі ўключаных у дагавор двухбаковых абавязацельстваў, дабіваючыся прыцягнення да адказнасці асоб, якія іх парушалі. Аднак, прызнаючы ўклад Закона аб працоўных калектывах ва ўдасканальванне рэгулявання прававых адносін у сферы працы, трэба адзначыць, што яго змест насіў у значнай ступені дэкларатыўны характар, не падмацоўваўся неабходным пашырэннем правоў прадпрыемстваў.

У другой палове 1980-х гг. у СССР пачынае ажыццяўляцца канцэпцыя «перабудовы», адной з задач якой становіцца пераход ад адміністрацыйных да пераважна эканамічных метадаў кіраўніцтва. На прадпрыемствах, працуючых у новых умовах гаспадарання, мяняецца змест калектыўных дагавораў: змяншаецца колькасць агульнаправавых норм, сацыялістычных абавязацельстваў; прадугледжваюцца мерапрыемствы, звязаныя з пашырэннем самастойнасці прадпрыемстваў, гаспадарчым разлікам, узмацненнем матэрыяльнай зацікаўленасці працоўных калектываў у паляпшэнні вынікаў працы. Дынаміка заключэння і эфектыўнасць калектыўных дагавораў у другой палове 1980-х гг. прадстаўлена ў табліцы [4, с. 277; 8, арк. 12].

***Табліца.*** **– Заключэнне калектыўных дагавораў у БССР у 1985–1989 гг.**

| Паказчыкі | 1985 г. | 1986 г. | 1987 г. | 1988 г. | 1989 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| Усяго заключана калектыўных дагавораў | 6410 | 6442 | 6587 | 6661 | 6625 |
| Уключана ў калдагаворы ўзаемных абавязацельстваў адміністрацыі і прафкамаў прадпрыемстваў, арганізацый, усяго (тыс.) | 613,7 | 706,1 | 711,9 | 534,4 | 463,4 |
| Удзельная вага невыкананых абавязацельстваў і мерапрыемстваў (%) | 2,5 | 3,1 | 2,6 | 2,4 | 2,5 |
| Пры заключэнні калдагавораў паступіла прапаноў ад працоўных | 54517 | 60078 | 61792 | 61456 | 56579 |
| з іх уключана ў дагаворы | 39199 | 43108 | 44172 | 42196 | 42720 |
| Удзельная вага ўключаных абавязацельстваў (%) | 71,9 | 71,8 | 71,5 | 68,7 | 75,5 |

Як бачна з даных, прыведзеных у табліцы, колькасць узаемных абавязацельстваў адміністрацыі і прафкамаў прадпрыемстваў, арганізацый, уключаных у калдагаворы, панізілася на карысць якасці: абавязацельствы станавіліся больш канкрэтнымі, рэальна можна было пракантраляваць іх выкананне; павялічылася колькасць уключаных у калдагаворы прапаноў працоўных, паступіўшых на стадыі абмеркавання праекта дагавора (з 71,9 % у 1985 г. да 75,5 % у 1989 г.).

Найбольш актыўна і паспяхова ў гэтыя гады займаліся калектыўна-дагаворнай працай камітэты прафсаюзаў: рабочых аўтамабільнага, трактарнага і сельскагаспадарчага машынабудавання; аўтатранспарту і шасэйных дарог; мясцовай прамысловасці і камунальна-бытавых прадпрыемстваў; харчовай прамысловасці; тэкстыльнай і лёгкай прамысловасці; хімічнай і нафтахімічнай прамысловасці. Калектыўныя дагаворы на прадпрыемствах, якія абслугоўваліся гэтымі прафсаюзамі, у значнай ступені адлюстроўвалі інтарэсы працоўных, былі накіраваны на справядлівае выкарыстанне фондаў аплаты працы, матэрыяльнага заахвочвання, сацыяльнага развіцця калектыву, стварэнне неабходных умоў працы і яе аховы. Разам з тым, аналіз эфектыўнасці заключэння і выканання калектыўных дагавораў у другой палове 1980-х гг. паказвае, што з году ў год найбольшая колькасць нерэалізаваных абавязацельстваў і мерапрыемстваў адносілася да раздзелаў: «Выкананне дзяржаўных планаў, сацыялістычных абавязацельстваў» (у 1985 г. – 29 % ад агульнай колькасці невыкананых абавязацельстваў); «Укараненне дасягненняў навукі, тэхнікі, перадавога вопыту, навуковай арганізацыі працы» (у 1986 г. – 10,9 % ад колькасці невыкананых абавязацельстваў); «Ахова працы» (у 1986 г. – 15,5 %); «Аплата і нарміраванне працы», «Жыллёва-бытавое абслугоўванне працоўных і арганізацыя грамадскага харчавання», «Умацаванне дысцыпліны працы» [9, арк. 11, 47, 48; 10, арк. 11; 11, арк. 2].

Узрасла сацыяльная накіраванасць калектыўных дагавораў. У іх часцей сталі ўключацца палажэнні, які выходзілі за рамкі вузкапрафесійных інтарэсаў, напрыклад, звязаныя з клопатам аб здароўі працуючых, аб жанчынах, сям'і, моладзі, ветэранах вытворчасці. На шэрагу прадпрыемстваў (мінскім ВА «Інтэграл», магілёўскім «Хімвалакно», Магілёўскім металургічным заводзе, Гродзенскай фабрыцы мастацкіх вырабаў) было прадугледжана калдагаворамі патаненне харчавання ў сталовых, а на Гродзенскім тонкасуконным, віцебскім «Кераміка», гомельскім «Цэнтраліт», мазырскім нафтаперапрацоўчым прадпрыемствах – бясплатнае харчаванне для працуючых у начную змену. Узмацнілася накіраванасць калектыўных дагавораў на ўмацаванне здароўя працоўных. На Магілёўскім металургічным заводзе працаўнікам, якія адмовіліся ад курэння, а ў аб'яднанні «Мінскпрамбуд», барысаўскім заводзе «Аўтагідраўзмацняльнік» тым, хто не меў на працягу года бальнічных лісткоў (акрамя догляду за хворымі), павялічвалася на 15–20 % узнагароджанне па выніках працы за год. У Гродзенскім ВА «Азот» сем'ям з трыма малалетнімі дзецьмі, дзецьмі-блізнятамі, а таксама маці-адзіночкам ажыццяўлялася прадпрыемствам аплата за дзіцячыя сады і яслі. На заводах «Чырвоны Кастрычнік» у Оршы, аўтатрактарнага электраабсталявання і «Аўтагідраўзмацняльнік» у Барысаве, у аб'яднанні «Мінскнерудпрам» жанчынам прадастаўлялася магчымасць знаходзіцца ў часткова аплачваемым водпуску па догляду за дзіцём да трох гадоў [12, с. 226; 13, арк. 61-63].

У калектыўных дагаворах больш увагі стала надавацца патрэбам моладзі. У аб'яднанні «Мінскпрамбуд», на гомельскім заводзе «Электраапаратура» у калектыўных дагаворах на 1988 г. прадугледжвалася выплата ад-

УМЦ БГПУ

наразовай дапамогі працаўнікам, якія вярнуліся з арміі. На шэрагу прадпрыемстваў маладым сем'ям прадастаўляліся беспрацэнтныя пазыкі. Узмацненне сацыяльнай накіраванасці калектыўных дагавораў, прымяненне дадатковых сацыяльных ільгот для працоўных было адобрана 3 ліпеня 1989 г. сакратарыятам Белсаўпрафа і рэкамендавана для шырокага распаўсюджвання [13, арк. 11].

З кожным годам павялічвалася колькасць прадпрыемстваў, прафкамы якіх, праяўляючы прынцыповасць і настойлівасць, дабіваліся рэалізацыі ўсіх дагаворных абавязацельстваў. У 1988 г. поўнасцю былі выкананы калектыўныя дагаворы ў вытворчых аб'яднаннях: «Карал», «Эмальпосуд» Гомеля, «Азот» Гродна, «Пінскдрэў», «Віцебскдрэў», на Гродзенскім заводзе карданных валаў, Ваўкавыскім заводзе дахавых і будаўніча-аддзелачных машын, мінскім заводзе № 407 грамадзянскай авіяцыі, у трэстах сталовых Маскоўскага раёна г. Мінска і на многіх іншых прадпрыемствах [8, арк. 5; 12, с. 227].

Разам з заключэннем калектыўных дагавораў на прадпрыемствах прафсаюзныя органы з 1985 г. пачалі заключаць з міністэрствамі і ведамствамі рэспублікі галіновыя пагадненні па аплаце працы, па пытаннях арганізацыі спаборніцтва, укаранення новай тэхнікі, паляпшэння ўмоў і аховы працы. У 1985 г. было заключана 13 галіновых тарыфных пагадненняў [10, арк. 17-25; 14, арк. 8]. Хоць некаторыя з іх яшчэ слаба ўплывалі на павышэнне эфектыўнасці вытворчасці, тым не менш яны паслужылі добрай асновай для рэспубліканскіх камітэтаў прафсаюзаў пры пераходзе да шырокага заключэння галіновых тарыфных пагадненняў у 1990-х гг. [12, с. 227].

27 лістапада 1987 г. пастановай Прэзідыума УсеЦСПС і Дзяржкампрацы СССР было зацверджана новае Агульнае палажэнне аб парадку заключэння калектыўных дагавораў замест палажэння ад 28 верасня 1984 г. [15, с. 41-47]. Былі адменены абавязковае рассыланне дырэктыўных пісем, што давала магчымасць работнікам самім вызначаць змест калектыўнага дагавора, і рэгістрацыя калдагавораў [16, с. 227–228].

Аднак канец 1980-х гг. характарызаваўся хуткімі разбуральнымі працэсамі ў краіне. Правядзенне рэформ у перыяд гарбачоўскай «перабудовы» без прадуманай стратэгіі прывяло да крызісу эканомікі і палітыкі. Закон СССР аб дзяржаўным прадпрыемстве (аб'яднанні), уведзены ў дзеянне з 1 студзеня 1988 г., павялічыў самастойнасць прадпрыемстваў, але моцна зменшыў кантроль дзяржавы над эканамічнымі працэсамі, што мела наступствам скарачэнне інвестыцый у развіццё вытворчасці, рост дэфіцыту тавараў, увядзенне ўладай розных картак і купонаў для рэгламентаванага размеркавання. Ва ўмовах зніжэння жыццёвага ўзроўню насельніцтва адрадзіўся рабочы рух, з'явіліся альтэрнатыўныя прафсаюзы, што прадвызначыла прыняцце ў кастрычніку 1989 г. Закона СССР «Аб парадку вырашэння калектыўных працоўных спрэчак (канфліктаў)». У ім падкрэслівалася, што ён рэгулюе парадак вырашэння калектыўных працоўных спрэчак па пытаннях прымянення заканадаўства аб працы, заключэння і выканання ўмоў калектыўных дагавораў і пагадненняў [17, с. 101-102]. Закон засноўваўся на міжнародна-прававых актах і замежнай практыцы вырашэння працоўных канфліктаў, але не стаў эфектыўным рэгулятарам калектыўных працоўных спрэчак, аб чым сведчыў рост забастовачнага руху ў краіне і прыняцце пазней, пасля распаду СССР, расійскага і беларускага законаў «Аб парадку вырашэння калектыўных працоўных спрэчак (канфліктаў)».

*Заключэнне.* Такім чынам, далейшае развіццё ў 1970–1980-х гг. калектыўна-дагаворнага рэгулявання працоўных адносін мела важнае значэнне для павышэння актыўнасці працоўных мас і ролі прафсаюзаў, садзейнічала паляпшэнню ўмоў працы рабочых і служачых. Аднак у калектыўна-дагаворнай рабоце было шмат хібаў. Калектыўныя дагаворы з'яўляліся фармальным дакументам, па сутнасці ўяўлялі сабой план сумесных дзеянняў адміністрацыі і прафсаюзнага камітэта па паляпшэнні ўмоў і аховы працы, рашэнні іншых сацыяльных пытанняў на прадпрыемстве. Можна пагадзіцца з расійскім вучоным-эканамістам Ю. М. Астапенка, якая адзначае: «У савецкі перыяд інтэнсіўна выкарыстоўвалася ўся атрыбутыка сацыяльнага партнёрства – заключэнне калектыўных дагавораў і пагадненняў, удзел працоўных у кіраванні вытворчасцю, кансультацыі і перамовы па працоўных і сацыяльных пытаннях, – аднак ніхто не называў гэту практыку сацыяльным партнёрствам. Лічылася, што аснову савецкага ладу складала эканамічнае, сацыяльна-палітычнае і маральнае адзінства ўсіх членаў грамадства, у якім не існавала супрацьлеглых па сваім змесце інтарэсаў, а таму не было неабходнасці ў такім механізме ўзгаднення інтарэсаў, як сацыяльнае партнёрства» [18, с. 196].

Спробы ажывіць калектыўна-дагаворную справу прымаліся ў першай палове 1980-х гг., калі быў адноўлены нарматыўна-прававы статус калдагавораў. Аднак у ходзе «перабудовы» ўзялі верх разбуральныя тэндэнцыі,

УМЦ БГПУ

што прывяло да сацыяльна-эканамічнага і палітычнага крызісу ў краіне.

Разам з тым, пэўны вопыт калектыўна-дагаворнога рэгулявання працоўных адносін, атрыманы ў даследуемы перыяд, знайшоў прымяненне пры фарміраванні сістэмы сацыяльнага партнёрства ў Рэспубліцы Беларусь у 1990-я гг. і таксама можа быць выкарыстаны ў сучаснай практыцы яго развіцця. Калектыўна-дагаворнае рэгуляванне працоўных адносін з'яўляецца фундаментам сацыяльна-працоўнага партнёрства. Яно садзейнічае ўстойліваму сацыяльна-эканамічнаму развіццю беларускага грамадства.

*Літаратура і крыніцы*


1. *Дубовік, А. А.* Дзейнасць прафсаюзаў Беларусі па калектыўна-дагаворным рэгуляванні працоўных адносін у перыяд нэпа / А. А. Дубовік // Весці БДПУ. Сер. 2. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2015. – № 4. – С. 36–42.
2. *Дубовік, А. А.* Аднаўленне і развіццё калектыўна-дагаворнай работы ў БССР (канец 40-х – 60-я гг. ХХ ст.) / А. А. Дубовік // Весці БДПУ. Сер. 2. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2020. – № 4. – С. 24–28.
3. История рабочего класса Белорусской ССР : в 4-х т. / Акад. наук БССР, Ин-т истории ; редкол.: П. Т. Петриков [и др.]. – Минск : Наука и техника, 1984–1987. – Т. 4. Рабочий класс на этапе совершенствования социализма, 1961–1986. – 1987. – 510 с.
4. История профсоюзного движения Беларуси / П. Г. Давидюк [ и др.] ; под ред. Л. П. Козика. – Минск : ФУАинформ, 2005. – 416 с.
5. *Обухович, А. П.* Школа миллионов / А. П. Обухович. – М. : Профиздат, 1975. – 120 с.
6. *Ширинкина, О. Ю.* Коллективный договор: история вопроса и современное состояние : автореф. дис. … канд. юрид. наук : 12.00.05 / О. Ю. Ширинкина ; [Ростовский госуниверситет]. – Пермь, 2006. – 25 с.
7. *Дубовик, А. К.* Коллективно-договорное регулирование социально-трудовых отношений в Беларуси: история и современность / А. К. Дубовик, Э. Г. Вайнилович // Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі: стан, здабыткі і супярэчнасці, перспектывы развіцця : матэрыялы міжнар. канф. – Гродна, 2003. – Ч. 4. – С. 198–204.
8. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 265. Воп. 15. Спр. 749.
9. НАРБ. – Ф. 265. – Воп. 15. – Спр. 468.
10. НАРБ. – Ф. 265. – Воп. 15. – Спр. 517.
11. НАРБ. – Ф. 265. – Воп. 15. – Спр. 607.
12. *Давидюк, П. Г.* Из истории становления социального партнерства / П. Г. Давидюк // Организация и управление. – 2002. – № 1–2. – С. 224–233.
13. НАРБ. – Ф. 265. – Воп. 15. – Спр. 791.
14. НАРБ.– Ф. 265. – Воп. 15. – Спр. 582.
15. Сборник постановлений ВЦСПС. 1987. Октябрь – декабрь / сост. Н. К. Макаренко. – М. : Профиздат, 1988. – 192 с.
16. *Урсалова, О. В.* Из истори и правового регулирования коллективных договоров в России / О. В. Урсалова // Правоведение. – 2002. – № 3. – С. 217–228.
17. *Михеев, В. А.* Основы социального партнерства: теория и политика / В. А. Михеев. – М. : Экзамен, 2001. – 448 с.
18. *Остапенко, Ю. М.* Экономика труда : учеб. пособие / Ю. М. Остапенко. 2-е изд. – М. : Инфра-М, 2007. – 272 с.


*References*


1. *Dubovik, A. A.* Dzjejnasc" prafsajuzaw Belarusi pa kalektywna-dagavornym reguljavanni pracownyh adnosin u peryjad NEPa / A. A. Dubovik // Vjesci Belarus. dzjarzh. ped. un-ta. Ser. 2, Gistoryja. Filasofija. Palitalogija. Sacyjalogija. Ekanomika. Kul"turalogija. – 2015. – № 4. – S. 36–42.
2. *Dubovik, A. A.* Adnawlenne i razviccjo kalektywna-dagavornaj raboty w BSSR (kanec 40-h – 60-ja gg. XX st.) / A. A. Dubovik // Vjesci BDPU. Ser. 2, Gistoryja. Filasofija. Palitalogija. Sacyjalogija. Ekanomika. Kul"turalogija. – 2020. – № 4. – S. 24–28.
3. Istoriya rabochego klassa Belorusskoy SSR : v 4-kh t. / Akad. nauk BSSR, In-t istorii ; redkol.: P. T. Pietrikov [i dr.]. – Minsk : Nauka i tekhnika, 1984–1987. – T. 4. Rabochiy klass na etape sovershenstvovaniya sotsializma, 1961–1986. – 1987. – 510 s.
4. Istoriya profsoyuznogo dvizheniya Belarusi / P. G. Davidyuk [i dr.] ; pod red. L. P. Kozika. – Minsk: FUAinform, 2005. – 416 s.
5. *Obuhovich, A. P.* Shkola millionov / A. P. Obuhovich. – M. : Profizdat, 1975. – 120 s.
6. *Shirinkina, O. Ju*. Kollektivnyj dogovor: istorija voprosa i sovremennoe sostojanie : avtoref. dis. … kand. jurid. nauk: 12.00.05 / O. Ju. Shirinkina ; [Rostovskij gosuniversitet]. – Perm", 2006. – 25 s.
7. *Dubovik, A. K.* Kollektivno-dogovornoe regulirovanie social"no-trudovyh otnoshenij v Belarusi: istoriya i sovremennost" / A. K. Dubovik, E. G. Vajnilovich // Aktual"nyja prablemy gistoryi Belarusi: stan, zdabytki i supjarjechnasci, perspektyvy razviccja: matjeryjaly mizhnarod. kanf. – Grodna, 2003. – Ch. 4. – S. 198–204.
8. Nacyjanal'ny arhiw Respubliki Bjelarus' (NARB). – F. 265. Vop. 15. Spr. 749.
9. NARB. – F. 265. Vop. 15. Spr. 468.
10. NARB. – F. 265. Vop. 15. Spr. 517.
11. NARB. – F. 265. Vop. 15. Spr. 607.
12. *Davidyuk P. G.* Iz istorii stanovleniya sotsial'nogo partnerstva / P. G. Davidyuk // Organizatsiya i upravleniye. – 2002. – № 1-2. – S. 224–233.
13. NARB. – F. 265. Vop. 15. Spr. 791.
14. NARB. – F. 265. Vop. 15. Spr. 582.
15. Sbornik postanovleniy VCSPS. 1987. Oktyabr' – dekabr' / Sost. N. K. Makarenko. – M. : Profizdat, 1988. – 192 s.
16. *Ursalova, O. V.* Iz istorii pravovogo regulirovaniya kollektivnykh dogovorov v Rossii / O. V. Ursalova // Pravovedenie. – 2002. – № 3. – S. 217–228.
17. *Mikheev V. A.* Osnovy sotsial'nogo partnerstva: teoriya i politika / V. A. Mikheev. – M. : Ekzamen, 2001. – 448 s.
18. *Ostapenko Yu. M.* Ekonomika truda: Ucheb. posobiye. – 2-e izd. / Yu. M. Ostapenko. – M. : Infra-M, 2007. – 272 s.


УМШ БДПУ